Hety numar „Bieł. Krynicy“ z dadatkam „Praleski“

Cana 10 hr.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 21 (662). Wilnia, Niadziela 10 Traŭnia 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Padpiska u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

75-ЛЕЦЬЦЕ СКАСАВАНЬНЯ ПАНШЧЫНЫ

Што такое паншчына, ня трэба шмат тлумачыць. Яшчэ жывуць старыя людзі, якія яе памятуюць, або людзі, якія аб паншчыне чулі расказы ад беспасрэдных яе сьведкаў. Даволі тут сказаць агулам, што паншчына ці,як інакш яе называюць, прыгон — гэта быў такі соцыяльны парадак, пры якім і зямля і людзі, што на зямлі працавалі, былі ўласнасьцяй паноў.

Сьпярша сяляне былі людзі вольныя, а тыя землі, на якіх яны працавалі, былі іх уласнасьцяй.З бегам, аднак, часу паны землі іх пазаваёўвалі, а іх самых зрабілі сваімі паднявольнымі слугамі, уважаючы іх, як звычайную рэч, ці скаціну, якую можна купляць, прадаваць, замяняць і г. д. Так напр. расейскі пісьменьнік Карамзін піша, што ў канцы XVIII ст. цана прыгоннага селяніна была ад 35 да 80 рублёў, у тым-жа часе за добрага гончага сабаку паны адзін другому плацілі часам па 3 тысячы рублёў. Адзін пан, заўважыўшы ў ваднэй прыгожай дзяўчыны акторскія здольнасьці, прадаў яе за 5 тысяч рублёў. Узноў-жа ведамы палюбоўнік царыцы Кацярыны II Патёмкін купіў ад другога царыцынага палюбоўніка Разумоўскага ўсю аркестру: музыкантаў і інструмэнты за 40 тысяч рубл.

Але ўсякае зло вечна трываць на сьвеце ня можа, прыходзіць час, калі ўсякае зло ліха бярэ. Прыйшоў канец і на паншчыну. Людзі паразумнелі, пасьвятлелі і ўбачылі, што такой ганьбы, як прыгон, далей цярпець ня можна. Скасаваньне яе сьпярша адбылося ў Зах. Эўропе, а пасьля прыйшла чарга на Расею і на Беларусь. Паны агулам не хацелі сялянам даць свабоду і ўпіраліся пры паншчыне. Так напр., калі яшчэ ў 1855 г. расейскі цар Александар II прыпомніў у Маскве на сабраньні паноў, што ўжо быў-бы час скасаваць прыгон, ні адзін з іх цара ў гэтым не падтрымаў. А паны, за дужа малымі выняткамі, аднальковыя, як у Расеі, так і ў Беларусі. Яны толькі тады згадзіліся даць свабоду сялянам, калі ўбачылі, што ўжо ўсёроўна ня ўтрымаюць іх. Змушалі іх да гэтага сялянскія бунты, а так-жа й сама прыгонская гаспадарка, якая, як перастарэлая, з надыходам і разьвіцьцём капіталізму ў Расейскай імпэрыі, мусіла ўступіць месца гаспадарцы новай, больш рацыянальнай і інтэнсыўнай, пры якой вялікія масы на панскай зямлі прыгонных сялян мала прыносілі карысьці і былі часта звычайным цяжарам.

Афіцыяльна асвабаджэньне ў Расейскай імпэрыі сялян ад прыгону наступіла царскім указам Александра II 19.II.1861 г. Да Беларусі, асабліва да заходніх яе часьцін, з прычыны польскага паўстаньня 1863 г., яно дайшло аканчальна толькі аж у 1864 г.

Сутнасьць скасаваньня прыгону была ў тым, што сялян надзялілі зямлёй за выкуп, разложаны на доўгатэрміновую сплату. Дзеля таго аднак, што сусім пазбыцца сялян, як дармовай працоўнай сілы, паном было не на руку, дык яны, ад якіх бадай выключна залежыла надзяляньне, давалі сялянам зямлі дужа мала і пры тым якнайгоршай, каб гэткім чынам далей трымаць сялян эканамічна залежнымі ад двара і як найтаней пасьля наймаць іх да сябе на працу.

Пры гэткім «асвабаджэньні» сялянам было трудна разжыцца, а да таго сялянскія надзелы ўсьцяж драбіліся і драбіліся з прычыны падзелу іх пры нарастаньні насельніцтва.

Урэшце прыйшла вайна і рэвалюцыя і, дзелячая Беларусь, савецка-польская граніца. Каб парадзіць сялянскай бядзе, на той бок гэнай граніцы сусім скасавалі прыватную ўласнасьць і завялі зямельныя гаспадаркі колектыўныя, супольныя. Жыцьцё аднак паказала, што поўнае скасаваньне прыватнай уласнасьці, а гэтым самым і зламаньне асабовасьці чалавека, да дабра не вядзе. З гэтай прычыны, хоць нязначна, але пачалося там ад гэтага прынцыпу некатарае адступленьне.

На гэты бок савецка-польскай граніцы на беларускіх землях трывае фактычна прадваенная, што стварылася пасьля паншчыны, палажэньне сялянскай прыватна-ўласьніцкай гаспадаркі — дробіцца яна далей і робіцца штораз больш агулам яўна несамавыстарчальнай. Зямельная рэформа праводзіцца жаўлаковым шагам і ца таго, як гэта відаць з асадніцтва, мае часта больш палітычныя, як эканамічныя мэты.

З гэтага бачым, што зямельная праблема на беларускіх землях, як на гэным баку савецка-польскай граніцы, так і на гэтым, дагэтуль не разьвязана і чакае адпаведнай апрацоўкі і належнага, згоднага з інтарэсамі беларускага народу, вырашэньня.

Здаецца нам, што БНА, якое ў сваей праграме шукае разьвязкі беларускай зямельнай праблемы на падставе сынтэзы гаспадаркі, апёртай на ўласнасьці прыватнай і колектыўнай, дзе гэтага вымагаюць вонкавыя варункі і прыгатаваньне псыхічнае, знаходзіцца на правільнай дарозе.

Астаецца толькі гэтыя праграмныя, дужа агульныя, зямельныя прынцыпы БНА, дапоўніўшы іх ідэяй коопэратызму, далей распрацоўваць і конкрэтызаваць.

Гэтымі думкамі жадалі мы падзяліцца з нашымі чытачамі з нагоды мінуўшых у лютым месяцы сёлета 75 угодкаў скасаваньня прыгону.

KAZIMIER SWAJAK

(U 10-yja ŭhodki jahonaj śmierci)

Ab wialikich ludziach pamiać nikoli nia hinie. U ludzkoj dumcy žywuć i ciapier Dante, Šekśpir, Mickiewič, Puškin... Jany niaŭmiruščy. I naš biełaruski paet Ks. Kastanty Stepowič, pad mianiuškaj Kazimier Swajak, dla biełarusaŭ jość tak-ža niaŭmiruščym. Ad śmierci jaho ŭžo dziesiać hadoŭ prajšło, a my siahońnia jašče bolš razumiejem jaho i cenim. Projdzie sto i dźwieście i jašče bolš hadoŭ, a pamiać ab Swajaku ŭ biełaruskim narodzie trywać dalej budzie. Sam naš paet napisaŭ heta: „Nie pamior, naradziŭsia!“

Kazimier Swajak — heta wydatny biełaruski paet i aryhinalny biełaruski filozaf z adcieniem lohkaha pesymizmu.

Nia ŭ tym sprawa, što paet Kazimier Swajak napisaŭ tworaŭ nia duža mnoha. Wialikija paety inšych narodaŭ twaryli kudy bolš za našaha Kazimiera Swajaka, ale jany žyli ŭ swaim krai kudy pry lepšych abstawinach žyćcia narodnaha, ci ich asabistaha. A Kazimier Swajak wystupiŭ, jak paet tady, kali ciažkaja ruka čužynca hnuła biełaruski narod, kali hety narod tolki što pačynaŭ budzicca z swajho doŭhawiakowaha snu. Pa śmierci našaha paeta ŭžo prajšło dziesiać hadoŭ. Za hety čas mnoha čaho pieramianiłasia ŭ žyćci biełaruskim. Ale pryraŭniać-by niekatorych sučasnych biełaruskich paetaŭ i piśmieńnikaŭ da Kazimiera Swajaka, dyk u mnohim pakažycca jon macniejšym ad sučasnaści. Kazimier Swajak pierad nikim nia hnuŭsia. Jon byŭ biełaruski paet-niezaležnik. Wolny biełaruski narod, niezaležnaja Baćkaŭščyna — heta byŭ ideał našaha biełaruskaha paeta. Hety ideał swoj paet kidaŭ u šyrokija masy narodu. Kazimier Swajak heta adzin z pryhažejšych krasak biełaruskaha narodu. Usio biełaruskaje žyćcio ŭchapiŭ jon pamastacku i wyliŭ jaho ŭ pryhožaj paezii. U Swajaka biełaruskaja minuŭščyna, sučasnaść i budučynia,jak ciapier haryćpierad nami.

Siahońnia my, biełarusy, swajho paeta chwalim, bo jość za što jaho chwalić. Uliŭ jon biełaruskamu narodu žywuju nadzieju na lepšuju swaju budučyniu, u swaich tworach skrystalizawaŭ jon usiu biełaruskuju niadolu, adważna wystupiŭ, jak biełaruski paet-niezaležnik i wytrywaŭ u hetym až da mahiły. Jon pakazaŭ nam świetły i peŭny šlach da ščaścia biełaruskaha narodu. Kazimier Swajak dla nas, biełarusaŭ, jość fundamentalnym paetam. Jon dla nas—heta wuhławy kamień, na jakim nam naleža budawać swajo adradženskaje biełaruskaje žyćcio.

Škoda dla nas usich, što hety naš paet maładym pamior. Škoda, što doŭhaja jaho chwaroba tarmaziła jahonaje poetyckaje tworstwa!

Siahońnia ŭ nas jość mnoha takich, što jašče pomniać ks. K. Stepowiča i što z im byli asabista znajomyja. Jość, što razam z im žyli i hadawalisia.

Ja sam z im try hady siadzieŭ na školnaj ławie, a hod ja žyŭ z im u wadnej kwatery. Tady ja acaniŭ i najlepiej padhledziŭ charaktar u budučaha paeta ksiandza Kastantaha Stepowiča. Ja pomniu ciapier, jak tady ŭdarała mianie siła jahonaha rozumu i naciskała na mianie siła jaho woli. Jak i ŭsie my tahočasnyja ludzi, Kazimier Swajak z małku karmiŭsia rasiejskaj i polskaj kulturaj. Ale jon pieršy z nas rašuča adkinuŭ ad siabie adno i druhoje, jak najskarej swaim rozumam i wolaj pastupiŭšysia na swajo rodnaje biełaruskaje žyćcio. Kali ja z im pieršy raz u žyćci spatkaŭsia, užo ja tady byŭ pa prysiazie na wiernaść dla polskaha narodu. Kazimier Swajak na mianie hladzieŭ tady i paswojmu ŭśmichaŭsia i sumna kiwaŭ jon swajej haławoj, a ja jamu na heta swajej prysiahaj naruhaŭsia i dakučaŭ, sam nia wiedajučy, što rabiŭ. Dziesiać hadoŭ prajšło, pakul ja zrazumieŭ swoj błud, a Kazimier Swajak užo tady byŭ najlepšym maim wučycielem, tolki drenna, što ja nie chacieŭ tady jaho słuchać.

Ja z paetam žyŭ u wadnej nadta ciesnaj kwatery. Tam nia było nam čym dychać. Ja ŭstawaŭ nočču i wychodziŭ u harod na spacar. Paśla jon zachwareŭ na suchoty i jak my rasstalisia, to ŭžo doŭha nie sutykalisia. Urešcie, my znajšlisia na stanowiščach. Spačatku našy karjery pajšli roznymi darohami. Ab ksiandzu Kastantym Stepowiču jahonyja duchoŭnyja ŭłady praniuchali, što jon biełarus, dyk i pačali jaho haniać i nad im śmiajacca, jak heta z biełarusami ŭsiudy i zaŭsiody rabiłasia. Ja-ž, jak wiernaje „polskaje“ dzicia, žyŭ tady ŭsiudy z faworami. Pa hadoch dziesiaci ja ŭznoŭ, choć nakoratka, spatkaŭsia z našym biełaruskim paetam. Ciapier my z saboj hawaryli, jak biełaruskija dziejačy. U Dziśnienščynie ŭ 1921 hodzie polski rewirowy wysmaliŭ papierynu da adnaho probaršča, kab toj spyniŭ hawaryć pabiełarusku kazańni. Kab paznajomicca z usiej henaj sprawaj, Kazimier Swajak pryjechaŭ u Dziśnienščynu. Tady jon bačyŭsia z mnohimi dziejnymi biełarusami. Tady paet byŭ užo wielmi chwory. Ja pomniu, jak my na sałomie ŭ adnym pakoi ŭsiu noč pa padłozie kačalisia i zasnuć nie mahli. Paet naš tady ŭsiu noč biazustanku kašlaŭ. Piać hadoŭ prajšło paśla hetaha, i jon pamior. Zrazumiełaja reč, što chwaroba jamu duža pieraškodziła ŭ jahonaj poetyckaj pracy.

Z poetyckaj tworčaści Kazimiera Swajaka jość najbolš wiedamy zbornik wieršaŭ „Maja Lira“. Tam nadrukawana 50 strojnych wieršaŭ i try karotkija razwažańni.

Dziesiać hadoŭ prajšło ad śmierci paeta, a dumki jaho žywuć i rastuć u biełaruskim narodzie. Ziernie, kinutaje paetam u biełaruskija hušču, raście dalej i nabiraje siły. Siahońnia biełaruskija ideały kudy macniejšyja ŭ narodzie, jak byli jany tady, kali paet naš žyŭ. Najlepiej my, biełarusy, ŭšanujem pamiać swajho paety, kali my pojdziem tymi darohami, jakija jon nam pakazaŭ.

W. D—a.

Da Biełarusaŭ Katalikoŭ!

7 červienia sioleta, na św. Trojcu, adbudziecca biełaruskaja pilihrymka ŭ Kalwaryju kala Wilni.

Usich biełarusaŭ, jakija źbirajucca sioleta adwiedać heta światoje miesca, zaklikajem dałučycca da biełaruskaj pilihrymki.

Treba prybywać u Wilniu na 6 červienia ŭ subotu. U hety dzień a hadzinie 6 taj wiečaram adbudziecca na wilenskich mohiłkach Rosa adkryćcie i paświačańnie pamiatnika nad hrobam biełaruskaha paeta Kazimiera Swajaka (Ks. K. Stepowiča).

Paśla hetaha ŭ zali Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury (Zawalnaja 1—1) adbudziecca ŭ čeść taho-ž paeta žałobnaja Akademija.

Nazaŭtra, u dzień św Trojcy, u kaściele św. Mikałaja a hadz. 7 min. 30 św. Imša, paśla jakoj pracesija ŭ Kalwaryju.

Prybyŭšyja ŭ Wilniu źbirajucca ŭ zali Biel. Instytutu Hasp. i Kultury (Zawalnaja 1—1), adkul buduć raźmieščany pa pryhatawanych dla pilihrymaŭ kwaterach.

Biełaruski Kaściełny Kamitet

Wilnia, 7.V.1936.

Усе сілы народу — на фронт барацьбы за родную беларускую школу!

Бацькі і Апякуны дзяцей у школьным веку! Складайце школьным уладам дэклярацыі з дамаганьнем беларускай школы.

Інструкцыі ў школьнай справе, формуляры дэклярацыяў і заяў, адозвы і т. п. высылае на жаданьне Школьны Сакратарыят — Вільня, Караleўская 3—8.

Z Litwy

Dalejšaje paradkawańnie ziamli. Ministerstwa Ziemlarobstwa pastanawiła sioleta padzialić na kalonii 158,541 ha sialanskaj ziamli, 18,558 ha dwornaj ziamli padzialić miž biezziamielnych i małaziamielnych, źlikwidawać 4,438 ha ziamli serwitutnaj, hramadzkim haspadarkam dać 4,927 ha. Dziela wykanańnia hetych rabot urad wyznačyŭ 231 ziemlamiera.

Sioleta sialanie bolš pradajuć. Litoŭskaje kooperatyŭnaje t-wa „Maistas" za pieršuju čećwierć siol. hodu zakupiła ŭ sialan roznych wyrabaŭ bolš, jak letaś. Fakt hety duža ažywiŭ sialanskuju haspadarku i palepšyŭ ekanamičnaje pałažeńnie sialan.

Razhrom abisynskaj armii — Nehus uciok zahranicu

Nadowiačy italijanskaje wojska zaniało abisynskuju stalicu Addis-Abebu. Abisynskaje wojska ŭžo pierastała baranić swaju baćkaŭščynu ad silniejšych italijanskich najezdnikaŭ. Nehus (car) Abisynii ŭciok z swajej świtaj zahranicu.

Takim čynam apošniaja niezaležnaja dziaržawa ŭ Afrycy, jakaja trywała dasiul praz 1600 hadoŭ niezaležnaj, staniecca kalonijaj eŭrapejcaŭ.

Paśla hetaha wykasujuć Abisyniju z śpisku siabroŭ Lihi Narodaŭ, dzie jana (Abisynija), jak „roŭnapraŭny" siabra, pawodle statutaŭ Lihi, mieła poŭnaje „zabiaśpiečańnie" nienarušalnaści jaje terytoryi i hwarancyju suwerennaj niezaležnaści.

Razhrom abisynskaj armii i akupacyja Abisynii heta adnačasna maralny razhrom Lihi Narodaŭ, jakaja sławami zabiaśpiačaje kožnaj dziaržawie (siabru Lihi) abaronu ad napaśnika.

Słowam, upadak abisynskaj dziaržawy — heta maralny ŭpadak Lihi Narodaŭ.

Parlamanckija wybary ŭ Francyi — pieramoha lewicy

U minułuju niadzielu ŭ Francyi zakončylisia parlamanckija wybary. U wybarach hetych pieramahli lewyja partyi. Na 614 pasolskich mandataŭ zdabyli: kamunisty — 73 mandaty, niezaležnyja kamunisty — 10, socyjalisty — 146, soc. respublikancy — 26, niezaležnyja socyjalisty — 9, radykały soc. — 115, niezal. radykały — 31, lewyja respublikancy — 83, narodnyja demokraty — 23, resp. demokraty — 38, konserwatysty — 11 i 4 mandaty inšyja partyi.

Lewyja partyi razam majuć 375 mandataŭ. Adnak nia susim poŭnaja pieramoha „narodnaha frontu", bo bolš 40 pasłoŭ lewych partyjaŭ z hetym frontam nie solidaryzujecca i mahčyma, što hetaja hrupa pasłoŭ u parlamancie budzie stajać miž prawicaj i „narodnym frontam".

Unutranaje pałažeńnie Polščy

(Pawodle zahraničnaje presy).

Zahraničnyja hazety ciapier šyroka pišuć ab unutranym pałažeńni Polščy. Bolšaść z ich wykazwaje pahlad, što kabinet premjera Kaściałkoŭskaha maje apiryšča ŭ prezydenta dziaržawy i ŭ hieneralnaha inspektara zbrojnaje siły hien. Rydz-Śmihłaha. Inšyja hazety ćwierdziać, što ŭ paławinie h. m-ca budzie rearhanizacyja ŭradu pad kličam demokratyzacyi jaho i paklikańnia apazycyjnych elementaŭ da supracoŭnictwa dla dabra dziaržawy.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Лекцыя. У нядзелю 3 траўня сёлета ў залі БІГіК у Вільні кс. В. Гадлеўскі прачытаў публічную лекцыю на тэму: „Залатая пара старадаўнай беларускай літаратуры (XVI стагодзьдзе)".

Суд. 5 г. м. Віленскі Гарадзкі Суд разглядаў справу рэд. Я. Пазьняка, абвінавачанага пасьля канфіскаты „Беларускай Крыніцы". У выніку разгляду справы Суд засудзіў рэд. Я Пазьняка на два тыдні арышту і 50 зл. штрафу.

Жалобнае набажэнства. Дня 6 траўня сёлета, а гадз. 7 мін. 30, у касьцеле сьв. Мікалая ў Вільні, кс. А. Станкевіч адправіў жалобнае набажэнства за спакой душы беларускага песьняра Казімера Сваяка (кс. К. Стэповіча), ад сьмерці якога ў гэты дзень мінула 10 гадоў.

Новая кніжыца. Нядаўна выйшла з друку новая беларуская кніжыца п. н. „Зьмена граматыкі беларускага языка ў БСРР". Напісаў і выдаў гэту кніжку др. Я Станкевіч. Цана яе 15 гр.

Студэнцкая экскурсія. У нядзелю 10 траўня Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні ладзіць „Першую веснавую вандроўку (экскурсію) ў Вэркі каля Вільні."

З САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

Юбілеі вышэйшых навуковых устаноў. Сёлета прыпадае 100-я гадаўшчына залажэньня ведамага на ўсім сьвеце Інстытуту Сялянскае Гаспадаркі ў Горы-Горках і 15-ыя гадаўшчына залажэньня Беларускага Унівэрсытэту ў Менску. — Цэнтральныя ўлады БССР дзеля наладжаньня сьвяткаваньня гэтых юбілеяў саранізавалі адпаведны Камітэт. „WB".

Зьмена на становішчы Народнага Камісара Асьветы БССР. У сувязі з праведзенай у канцы мін. году „чысткай", зволььнены быў са становішча так-жа народны камісар асьветы БССР Чарнушэвіч і яго заступнік Лешчынскі. — 15.IV сёл. на свабоднае да гэтага часу становішча камісара асьветы паклікалі А. Дзякова, б. дзекана гістарычнага факультэту Беларускага Унівэрсытэту ў Менску. „WB".

Мой адказ „Нашай Волі"

На Вашае запытаньне, грам. В. Склубоўскі, зьвернenae да мяне ў нумары 7 (8) „Нашай Волі" з 1936 г., адказваю:

Прачытайце ўважна перадавы артыкул „Нашай Волі" № 6 (7) з 12 красавіка 1936 г., дык будзе і Вам ясна.

Я. Пазьняк.

Міхась Машара.

Лёгкі хлеб.

3)

Драма ў трох актах, з жыцьця вясковай моладзі.

Ганулька — Даруйце! А я баялася-б выходзіць за Крукоўскага. Мо' ён і добры чалавек, але хто ведае, хто ён, адкуль. І зьвязаць сябе з такім? Зьвязаць на заўсёды? Не, сапраўды страшна.

Верачка — Ведаеш, Ганулька, Крукоўскі перадусім сумленны чалавек. Ён з Расеі. Быў афіцэрам. Уцёк ад бальшавікоў, служыў у Валаховіча Пэўна-ж, цяперашняе становішча яго зусім не паім. І яму абяцаюць лепшую службу ў Вільні.

А каб ты ведала, які ён чуткі, далікатны!..

Ганулька — Дагадываюся..., Інакш, ці-ж падабаўся-б гэтак Вам?!

Верачка — Але я зашмат шчырая, а ты ні слова, аб сабе і Васілю.

Ганулька — Што вы! Ды я нічога ня маю гутарыць. Васіль мной зусім ня цікавіцца, а калі прыходзіць да нас, дык затым, што ня мае дзе дзецца, прыехаўшы ў вёску. А ў нас кожны вечар моладзі поўна.

Верачка — Але ўхаджвае ж ён не за моладзю, я таксама чула. Але ты надта замкнутая!

Ганулька — Калі-ж ніякага каханьня няма між намі. Васіль калі і гутарыць са мной, дык ніколі аб каханьні.

Верачка — Дык аб чым-жа?

Ганулька — Аб усім... аб жыцьці, аб вёсцы, аб моладзі, аб сваіх таварышох і ніколі аб каханьні.

Верачка — Якая нудная тэма! Я нават ня веру, каб маладыя людзі гутарылі аб такіх сухіх рэчах.

Ганулька — Чаму? мне гэта падабаецца.

Верачка — Мо' затое, што гэта гутарыць Васіль?

Голас Мар'яны з кухні — Ганулька, прас ужо гатовы.

Ганулька — Выбачце, я на мінутку вас пакіну адну. Панудзіцеся, трэба выпрасаваць сукенку (*бяр сукенку і выходзіць*).

Зьява 3-я.

Верачка і Пятрусь.

Пятрусь (*апрануты па вясковаму, але чыста, уходзіць*) — Добры вечар!

Верачка — Добры вечар, пан Пятрусь!

Пятрусь — (*убачыўшы Веру*) Панна Вера тут? і адна? А дзе-ж Ганулька?

Верачка — Ганулька выйшла прасаваць сукенку, а вы да яе? Яна хутка прыйдзе.

Пятрусь — Не... (*мнецца*) Я... я так, — на сяло. Бо ў Ганулькі заўсёды хтось ёсьць з моладзі. А панна Вера? Мо' і вы да нас на сяло?

Верачка — Вы знаеце, я, амаль нікуды на вёску не хаджу, да Ганулькі прыйшла па сукенку.

Пятрусь — (*насьмела*) Панна Вера... Я хацеў-бы ў вас запытацца... толькі вы ня гневайцеся.

Верачка — Калі ласка... Я — слухаю.

Пятрусь — Я —чуў... У вёсцы кажуць... што вы думаеце выходзіць замуж, замуж за гэтага... гэтага Крука, ці гэта праўда? Скажыце? Толькі вы ня гневайцеся!

Верачка — Не, я ня гневаюся. Гавораць?... Хай гавораць. А калі і праўда, дык што каму да гэтага?

Пятрусь — Але я вас прашу, Верачка, панна Вера, не выходзьце замуж за яго.

Верачка — Чаму?

Пятрусь — Ведаеце... усе кажуць.. усе кажуць, што ён надта нядобры чалавек... Да гэтага, ніхто ня ведае, скуль ён і хто.

Верачка — Я вам надта ўдзячна, пан Пятрусь, за раду.

Пятрусь — Калі ласка, не завіце мяне панам. Пан...—гэта для мяне так няпрыемна. Быццам вы жартуеце, насьміваецеся нада мной.

Верачка — Нічого падобнага! Я да ўсіх так зьвяртаюся і вы вось завіцё мяне „паннай."

Пятрусь — Дык вам гэта адпавядае, бо вы ў сотню раз прыгажэйшая за кожную паненку.

Верачка — Дзякую за камплімэнт! Але вы таксама малады і прыгожы.

Пятрусь — Не жартуйце... Які я ў ліха пан? Зрэшта, я надта ня люблю гэтага слова. Ды гэта няважна... Я — не аб гэтым... Зрэшта, вы даўно гэта ведаеце... Верачка!... Панна Вера! Я вас прашу, ня выходзьце за гэтага Крука замуж!

Верачка — Чаму? Гэта надта дзіўна! Чаму вы мяне аб гэтым просіце?

Пятрусь — Я... Зрэшта, вы даўно гэта ведаеце, я даўно вас кахаю! Ведаю, што я вам ня пара. Я просты, вясковы, а вы, як паненка якая... Але я — жадаю вам шчасьця... А пан Крукоўскі, далібог, нядобры чалавек! Гэта ўсе кажуць.. гэта ўся вёска ведае.

Верачка — Дзякую за раду, пан Пятрусь!... і вы мне не праціўны, не, не. Але мы так дрэнна разумеем адзін другога.

Пятрусь — Мо' й праўда, але ня выходзьце за Крукоўскага, гэта мая апошняя просьба.

Зьява 4-я.

Тыя-ж і Ганулька.

Ганулька — (*на руках акуратна зложана сукенка*) Ну вось і гатова! Вы, панна Верачка, пэўна вельмі знудзіліся (*убачыўшы Пятруся*)

Roznyja wiestki

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

Wialiki palityčny praces U.O.N. U Lwowie 25 traŭnia sioleta pačniecca wialiki palityčny praces nad 23 ukraincami, jakim akt abwinawačańnia zakidaje prynaležnaść da Arhanizacyi Ukrainskich Nacyjanalistaŭ (O.U N.), niekatorych z ich winawaciać u zabojstwie J. Bačynskaha i dyrektara filii ukrainskaj himnazii ŭ Lwowie I. Babija, u pryhatawańni napadu na wałynskaha wajawodu Juzefskaha, načalnika Kosobudzkaha, na sawieckaha konsula ŭ Lwowie i t. d.

Z POLŠČY

„Heta pachnie rewalucyjaju“. Niadaŭna ŭ Waršawu pryjaždžaŭ z Lwowa b. premjer praf. Bartel, jaki na zapytańni waršaŭskich žurnalistaŭ ab lwoŭskich krywawych padziejach skazaŭ hetak: „Što-ž heta wy, panowie, wypiswajecie pa hazetach ab Lwowie? Byli tam rečy daloka pawažniejšyja! Kali ŭ ludziej stralajuć, a jany nia ŭciakajuć, ale iduć biaz strachu na śmierć, to heta ŭžo nia jość „zamieški“, ale heta pachnie rewalucyjaj“.

Bankroctwa sanacyi. Polskaja hazeta „Piast“ piša: chutka ŭžo nastupić kaniec sanacyi — hetaha biazidejnaha ruchu, jaki adbywajecca ŭ adasabnieńni ad hramadzianstwa. Sanacyja nia zmoža stwaryć žyćciowaj prahramy i nie zdabudzie dawieru ŭ hramadzianstwie. Sanacyjnaja hrupa h. zw. „naprawiače“ nie asiahnuć ułady ŭ Polščy, bo radykalnyja socyjalnyja kličy majuć ciapier bolšuju pierawahu ŭ hramadzianstwie nad jahonymi palityčnymi imknieńniami.

1-šy maj u Polščy. Pieršy maj, światа pracy, prajšoŭ u Polščy sioleta naahuł spakojna. U bolšych miestach adbylisia ŭračysta wialikija rabotnickija manifestacyi, u jakich brali ŭdzieł socyjalistyčnyja polskija i žydoŭskija arhanizacyi, a tak-ža i kamunisty, katoryja sioleta išli pobač z inšymi partyjami pad kličam supolnaha „ludowaha frontu“. Padčas pieršamajskich pachodaŭ rabotniki kidali roznarodnyja kličy i niaśli roznyja transparenty. Najbolšy pachod, u katorym brała ŭčaście niekalki dziesiatkaŭ tysiač robotnikaŭ, prajšoŭ pa wulicach Waršawy. U niekatorych miascowaściach padčas pachodaŭ endeki prabawali zrabić zabureńni, kidajučy antysemickija lozunhi, ale da krywawych zabureńniaŭ nidzie nie dajšło.

Z ZAHRANICY

Načalniki hieneralnych štabaŭ Litwy i Łatwii adwiedwali Maskwu. Hazety padajuć, što 29 krasawika sioleta pryjechaŭ u Maskwu načalnik łatwijskaha hieneralnaha štabu hienerał Hartmanis, razam z niekalkimi wyšejšaj ranhi aficarami. U pačatku traŭnia maje adwiedać Maskwu tak-ža i načalnik litoŭskaha hieneralnaha štabu pałkoŭnik Ciernius.

Aryšty nacyjanał-socyjalistaŭ u Niamieččynie. Niadaŭna ŭ Niamieččynie ŭ mnohich miascoch aryštawana šmat nacyjanał-socyjalistaŭ, u wadnym tolki Berlinie, pawodle hazetnych wiestak, aryštawana kala 600 čaławiek. Chodziać čutki, byccam henyja aryšty źwiazany z adkryćciom wialikaj zmowy prociŭ Hitlera.

Wajskowy wynachad u Niamieččynie. Jak padajuć hazety, niamieckija inžyniery wydumali niejkuju nowuju wybuchowuju miešaninu dla harmatnich strełaŭ. Hetyja nowyja strely majuć dwa razy bolšuju wybuchowuju siłu ad sučasnych, dziela hetaha niamieckija harmaty buduć stralać dwa razy dalej ad harmataŭ inšych armijaŭ.

50 mil. dalaraŭ dla niamieckich žydoŭ. Mižnarodnaja žydoŭskaja arhanizacyja pastanawiła sabrać 50 miljonaŭ dalaraŭ (260 mil. złot.) na pomač niamieckim žydom. Za hetyja hrošy henaja arhanizacyja choča wywieści z Niamieččyny jaknajbolš žydoŭ, kala 300 tys., a ŭsich žydoŭ u Niamieččynie siańnia krychu bolš 500 tys. Takim čynam, na adnaho žyda prypadaje pryblizna amal 1000 dalaraŭ, a na adnu žydoŭskuju siamju ŭ siarednim kala 4,000 (20.000 zł.).

Pahrom žydoŭ u Palestynie. Apošnim časam u Palestynie araby wostra wystupili suproć žydoŭ — daščentu zrujnawali niekatoryja žydoŭskija miesty, papalili mnoha budynkaŭ i pahrabili žydoŭskija kramy. Mnoha jość žydoŭ ranienych i zabitych. Hety krywawy procižydoŭski bunt arabaŭ u Palestynie zdušwaje tamašniaja anhielskaja palicyja j wojska. Araby damahajucca ad Anhlii: 1) nieadkładnaha strymańnia ŭsiakaje žydoŭskaje imihracyi ŭ Palestynu, 2) zabarony pradawać arabskuju ziamlu žydom i 3) zhody Anhlii na ŭtwareńnie ŭ Palestynie nacyjanalnaha arabskaha ŭradu. Pahrom žydoŭ u Palestynie hułkim recham adbiŭsia siarod žydoŭ pa cełym świecie.

Nacyjanalistyčnaja demonstracyja ŭ Adesie. U Sawieckaj Ukrainie ŭ Adesie na pačatku sioletašniaha hodu adbyłasia wialikaja krywawaja nacyjanalistyčnaja demonstracyja. Cikawa apiswaje jaje kijeŭskaja sawieckaja hazeta „Komunist“:

„Adstałyja elementy, znajučy ab tym, što Adesa jość miestam, dzie schodziacca ludzi roznaje nacyjanalnaści, i što tut pryjaždžajuć pradstaŭniki roznych dziaržaŭ, zachacieli pakazać im, što tut jość ludzi, niezadawolenyja z našaj ułady. I tamu ŭ dzień 22 studnia sabrali niekalki tysiač rabotnikaŭ i matrosaŭ i ŭstroili na bulwary Telmana demonstracyju. Na pieradzie jšli žančyny z dziaćmi, jakija niaśli sinia-žoŭtyja šmaty (hetak nazywajuć balšawiki ukrainskija fłahi), a za imi rabotniki i matrosy. Usie kryčali niezrazumiełyja kličy.

Kala wychadu z bulwara milicyja sikaŭkami razahnała demonstrantaŭ, užywajučy palnaj zbroi. Niekalki demanstrantaŭ aryštowana“.

Nad tryma studentami, što sarhanizawali henuju demonstracyju niadaŭna adbyŭsia sud, ab katorym saw. hazeta „Prawda“ piša: „Jany (henyja studenty) parazumiewalisia z adnym z zahraničnych konsulataŭ. Cieraz adnaho ŭradnika konsulatu dastali nacyjanalistyčnuju litaraturu i hrošy na ahitacyju. Śledztwa wykazała, što siarod studentaŭ u Adesie jany mieli niekalki tajnych hurtkoŭ, što čytali i pašyrali nacyjanalistyčnyja časapisy. Sud zakidaje im, što jany byli arhanizatarami wialikaha zabureńnia ŭ dzień 22 studnia na bulwary Telmana, dzie cieraz ich źhinuła niekalki dziesiatkaŭ rabotnikaŭ i matrosaŭ.

„Na prapazycyju prakurora Orodžonikidze zasudzili ŭsich troch na karu śmierci z tym, što wykanańnie prysudu budzie tolki paśla zakančeńnia śledztwa nad 2-ma ŭčaśnikami manifestacyi. Śledztwa pradoŭžyłasia tamu, što 2-och abwinawačanych u hetaj sprawie ŭciakło z astrohu“.

Kamunisty dachodziać da ŭłady ŭ Hišpanii Kamunisty ŭ Hišpanii, stwaryŭšy razam z socyjalistami supolny „narodny front“, usimi siłami imknucca da ŭłady. Dziela hetaha ŭwodziać jany wialiki chaos u dziaržaŭnym ładzie Hišpanii.

Pad naporam kamunistaŭ mocna chistajecca ciapierašni ŭrad Hišpanii i štoraz lawieje. Ciapier u Hišpanii adbywajucca pryhatawańni da wybaraŭ nowaha prezydenta dziaržawy. Wošža zaŭziata rychtujucca da ich pradusim kamunisty. Na adnej pradwybarnaj naradzie Wykanaŭčaha Kamitetu Narodnaha Frontu socyjalistyčny kandydat na prezydenta, kamunist Kaballero, pastawiŭ prapanowu kab dziaržawa ŭziała ŭ swaje ruki ŭsie pradpryjemstwy i skasawała prywatnuju ŭłasnaść. Hetaja jaho prapanowa bolšaściu hałasoŭ učaśnikaŭ sabrańnia była pryniata. U wybarach elektaraŭ, što majuć wybirać prezydenta, „narodny front“ zdabyŭ wialikuju pierawahu, bo až 263 mandataŭ, padčaskali inšyja partyi majuć—usiaho 54. Dziela hetaha zusim mahčyma, što nowym prezydentam Hišpanii moža być wybrany pradstaŭnik „narodnaha frontu“ — socyjalist abo kamunist. Hetak mohuć kamunisty zdabyć uładu ŭ Hišpanii.

Z WILNI

Pieršy Maj. Świata pracy „Pieršy Maj“ sioleta ŭ Wilni adbyłosia wielmi ŭračysta. Usie rabotnickija arhanizacyi i sajuzy salidarna wyjšli z ściahami na wulicu i naładzili salidny supolny pachod. U pachodzie prymali ŭčaście tak-ža i biełarusy. Rabotniki ŭ pachodzie wyjaŭlali, miž inšym, swaje adnosiny i sympatyi da biełaruskaha wyzw.-adradž. ruchu.

Выйшаў з друку і прадаецца ўложаны С. Паўловічам новы беларускі ілюстраваны лемантар пад наз.

„Першыя Зернятķі“

беларуская граматка для хатняга навучаньня. З многімі малюнкамі У. Паўлюкоўскага, Я. Драздовіча і іншых. Выданьне Я. Малецкага. Бачын 96, фармат 8°. Ёсьць гэта прыгожая кніжыца для дзяцей і старэйшых. Купіць можна ў кожнай беларускай кнігарні ў Вільні і на правінцыі. Цана пры выпісваньні з перасылкай: да 10 экз. па 50 гр., ад 10 да 20 — 45 гр., ад 20 да 50 — 40 гр., ад 50 і ўзвыш — 35 гр.

Галоўны склад: Беларуская Кнігарня „Пагоня“ Вільня, Завальная 1.

Выпісывайце! Чытайце!

„КАЛОСЬСЕ“

Друкуецца і выйдзе ў сьвет у палавіне траўня кніжка 2 (6) гэтага беларускага літаратурна-навуковага часапісу.

Прысланыя да 1-га траўня ў літаратурны і навуковы аддзелы, а такжа ў аддзел — хронікі матарыялы будуць зьмешчаны яшчэ ў гэтай кніжцы часапісу.

Складка на часапіс у год — 4 зл. На асобную кніжку — 1 зл.

Адрас: рэд. і адміністрацыя „Калосься“ — Вільня, Завальная 1—2.

А, і Пятрусь тут! Добры вечар, Пятрусёк! Дык вам пэўна вясёла было? Мо' я перашкодзіла? Дык перапрашаю.

Пятрусь — Добры вечар! Як гадуешся?

Ганулька — Нішто, дзякую!

Верачка — Не, вы нам не перашкодзілі і нудна нам ня было. Праўда, пан Пятрусь?

Пятрусь — Вы мо' жартуеце, а мне было прыемна.

Ганулька — (*аддаючы сукенку*) Вось ужо і зьвязана. Перапрашаю, што затрымала доўга.

Верачка — Нічога, нічога, бальшое спасіба!

Ганулька — Калі ласка... Насіце на здароўе.

Верачка — Затым бывайце! (*да Пятруся*) Бывайце, пан Пятрусь!

Ганулька — Усяго добрага!

Пятрусь— Бывайце, панна Вера! і помніце маю просьбу... Падумайце над гэтым.

Верачка — Добра, добра! Дзякую за раду. (*выходзіць*).

Зьява 5-я

Тыя-ж бяз Верачкі.

Ганулька — А... у вас усё-ж былі сакрэты! Можна даведацца аб чым вы яе прасілі? Мо' сваталіся ізноў?

Пятрусь — (*ходзячы, Ганулька парадкуе ў хаце*) А дзе там! Ты ведаеш, што яна мяне не кахае, дык варта аб гэтым гутарыць. Я прасьцерагаў яе, каб не выходзіла замуж за гэтага валацугу Крука.

Ганулька — Пятрусь, Пятрусь! А табе што? Ведаю — ты ўсьця-ж кахаеш яе. Але кажу табе, як сястра: выкінь ты яе з галавы. Мала дзяўчат ёсьць у вёсцы? Пакахай другую, кожная рада будзе. І чым яна табе так спадабалася? Мо' што гутарыць, як з кніжкі? Эх! шкода мне цябе, ці табе такая жонка патрэбна?

Пятрусь — Кінь Ганулька! не паможа тваё казаньне. Сам ведаю, што толку... Спрабуй сама раскахаць Васіля, дык зразумееш! Не саромся!... Ведаю! усё ведаю, — ды ты шчасьлівая!

Ганулька — Адкуль ты ведаеш? Што ты ведаеш? Пятрусёк, родненькі, ці Васіль табе што казаў?

Пятрусь — (*усьміхаецца*) Вось, як цябе азяло (*насьледуе яе папярэдні тон*) Ганулька, кінь! Што табе?... Чым ён табе спадабаўся так? Мо' мястовай вопраткай? Мала апроч яго хлапцоў у вёсцы? Пакахай другога; кожны рад будзе.

Ганулька — (*нецярплівa*) Пятрусь! Пятрусёк, кінь жарты.

Пятрусь — А, жарты! што, нясмачна? не падабаецца? тваё, братка, лякарства.

Ганулька — (*нецярплівa*) Скажы, чаму ты казаў шчасьлівая? Ці Васіль табе чаго не казаў? Вы-ж дружыце.

Пятрусь—Вось было-б прыгожа з майго боку, каб прыйшоў і разбаіў табе ўсё. Кажу табе шчасьлівая, а больш ня пытай.

Ганулька — Слухай Пятрусь, а чаму вы сяньня ня прышлі да нас у двух?

Пятрусь — Прыдзе, прыдзе... Ты толькі ня трывожся. Бачыш, у яго сяньня палісманы рабілі вобыск... Чагось шукалі. Пэўна набрахаў штось гэты Крук, бо былі і ў мяне; пыталіся, ці не даваў мне Васіль якіх кніжак, ці мо' гутарыў штось. Дык вось Васіль, пэўна, пасьля гэтых „гасьцей,“ парадкуецца яшчэ.

Ганулька — (*трывожна*) А ты дагэтуль нічагусенькі мне аб гэтым? Пятрусёк, мо' яго арыштавалі? Мо' ты ня кажаш мне?

Пятрусь — Кінь! ужо і арыштавалі.

Ганулька — Пятрусёк, браток, зьбегай паглядзі, што там дзеецца? чаму яго так доўга няма?

Пятрусь — Вось як табе шкода яго! Аж чалавека зайздрасьць бярэ! і дае Бог шчасьце людзям!

Ганулька — І табе дасьць... толькі кінь Верку.

Пятрусь — А ты ўсё сваё?

Ганулька — Ну, ня буду, ня буду, толькі хутчэй бяжы пабач!... і прыходзьце. Добра?

Пятрусь —(*кіруючыся да дзьвярэй*) Добра! Прывяду жывым і здаровым (*выходзіць*).

Зьява 6-я.

Ганулька адна.

Ганулька — Ах, як моцна б'ецца сэрца! Вось пракляты Крук... і што яму зрабіў Васіль? Мо' баіцца, каб не адбіў ад яго Верку? Надта яму патрэбна гэта паненка... Гэты, гэты зломак! Але чаго я так перапалохалася? што ён мне?... брат, ці сват?... І прад Пятрусём, а той раскажа Васілю і будуць сьмяяцца. Вось дурная!

Зрэшта, Пятрусь ня чужы і ня скажа (*стаіць нейкі час і думае*). Зрэшта, годзі хітрыць перад сабой. Так, — кахаю! Ох, як кахаю! Васіль мой, Васіль! Любы! Даражэнькі! І за што я яго так кахаю? Вось, як даведалася аб гэтай праклятай рэвізіі, дык здаецца сама паляцела-б да яго. Сябе-б аддала за яго... Васіль мой, Васілёчак! (*уходзіць Васіль*).

Зьява 7-я.

Ганулька і Васіль.

Васіль — (*Апрануты чыста, — памястоваму — уходзячы*) Добры вечар! Ці мяне хто, тут, ня клікаў?

Ганулька — Васіль!... пан Васіль!...

Васіль — Вось якраз так, і голас той самы. Але навошта ж „пан“? (*вітаюцца, Васіль затрымлівае яе руку*) Чаму Ганулька, зьвяртаючыся да мяне, усьцяж прыплятае гэтае брыд-

Пісьмы з вёскі

Ня поступ, але заняпад.

(З Косаўскага пав.)

Імкненьнем і задачай чалавека, між іншым, ёсьць палепшаньне свайго быту — поступ. Поступ гэты праяўляецца стала і адначасна ўва ўсіх галінах людзкога жыцьця. Калі-ж дзе-небудзь і ў чым-небудзь поступ затрымаецца, дык з часам наступае там заняпад, які блага адбіваецца на жыцьці чалавека. Гэнае апошняе зьявішча заўважваецца цяпер перадусім у эканамічным жыцьці розных дзяржаў сьвету. Гэты заняпад — крызыс, асабліва востра праяўляецца ў нашы Краі.

У Косаўшчыне, як і ў многіх іншых мясцовасьцях нашага Краю, пад уплывам гэнага крызысу, наступае ў сялянскім жыцьці паварот да варункаў і спосабаў жыцьця, якія былі сотні гадоў таму назад. У большасьці косаўскія сяляне малазямельныя і беззямельныя. У лепшыя часы ў нас рубалі многа лесу, і сяляне маглі пры гэтым зарабіць на розныя патрэбы, цяпер лесу рубаюць мала (ды й яго ўжо мала ёсьць), а другіх заработкаў няма. Многа сялян і моладзі ходзіць без работы. Ня маючы заработкаў і з нястачы зямлі, сяляне варочаюцца да прымітыўнага жыцьця і ўспамінаюць тыя часы, калі ня было йшчэ манапопяў на запалкі, соль, тутун і інш. Многія ўжо вярнуліся да лучыны. Ботаў таксама трудна ўжо ўбачыць, бо амаль усе носяць абутак з аўтамабільных гумовых апон. Нашы людзі часта пытаюць у тых асоб, што чытаюць газэты, ці скора вайна будзе. Яны думаюць, што праз вайну ці што-небудзь падобнае другое палепшыцца іхні быт.

Калісьці ў нашым павеце вяла беларускую культурна-асьветную працу ТБШ. Тады ў нашым павеце амаль у кожнай вёсцы была беларуская бібліятэка, у многіх вёсках былі ўтраквістычныя беларускія школы, часта ладзіліся беларускія прадстаўленьні, тады нашая моладзь працавала на беларускай культурнай ніве, бо былі свае беларускія арганізацыі. Цяпер-жа беларускіх арганізацыяў няма, затое ў многіх вёсках існуюць польскія арганізацыі, у якія нашая моладзь не запісваецца і гэтыя арганізацыі сапраўды культурнае працы не вядуць.

Па вёсках розныя інструктары і „рэфэрэнты рольнічыя“ ладзяць конкурсы і вучаць сялян, як садзіць бульбу, капусту і інш. Нашыя сяляне і самі ведаюць добра, як гэта ўсё рабіць, а бяда толькі ў тым, што ня маюць на чым. На нашых цяперашніх гаспадарках, калі-б пасадзіць такога інструктара, дык, як кажуць людзі, ён і лапці на іх скора пагубіў-бы. Нашым сялянам трэба прадусім даць адпаведную колькасьць зямлі, каб яны мелі сапраўдную магчымасьць садзіць і сеяць, а тады ўжо іх вучыць.

Беларуская нацыянальная сьведамасьць узрастае, моладзь вучыцца нават саматугам беларускае граматы і інш.

Сяляне Беларусы! Мы павінны імкнуцца да таго, каб у нашым Краі быў стала поступ, а не заняпад. Будзе-ж гэта тады, калі да лепшае долі будзем ісьці сваім беларускім нацыянальным шляхам.

Селянін.

Польская мова ў праваслаўнай царкве ў Беластоку.

У нашую царкву ўводзіцца польская мова, хоць многія праваслаўныя такіх навінак ня хочуць. Наш маладзенькі папок, як пачне папольску гаварыць навуку, дык людзі тады з царквы ўцякаюць, пакуль навука скончыцца. Па навуцы тыя людзі ўзноў у царкву прыходзяць далей набажэнства слухаць. Людзей нашых гэта злуе, але ўсе баяцца і маўчаць, бо каму-ж ты пры сяньняшніх парадках пажалішся... Ня можам мы ніяк зразумець свайго маладога папка-паляка, чаму ён адыходзе ад нашай старой традыцыі. Каб нашыя продкі пачулі ягоную ў царкве папольску навуку, дык заварушыліся-б у магіле. А ён, наш малады „айцец“, дык не глядзіць на гэта і пасвояму ўсё стараецца, каб некаму падабацца. Але з народам, дык ня йдзе гэты наш „баценька“. А мы-ж тут усе беларусы і гаворым пабеларуску. Мяне ў Беластоку раз неяк пытаўся адзін духоўнік: „А скуль ты пабеларуску ўмееш“. Я духоўніку гэнаму паставіла вочы, ды кажу: „А гэта-ж што? Ці-ж беларуская мова не мая родная мова!?“ Ах, як-бы я любіла, каб у нашай царкве, ды замест польскіх казаньняў завяліся беларускія! Кажуць людзі сяньня, што на сьвеце свабода, дык чаму-ж для беларусаў у Беластоку не завясьці беларускіх у царкве навукаў!

Вера.

Ab kulturnaj pracy, rewizii i kooperatywie.

Lachawičy kala Baranawič. 25 sakawika sioleta Lachawicki Hurtok BIHiK naładziŭ światkawańnie 18-tych uhodkaŭ Abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi. U prysutnaści blizu ŭsich siabroŭ i wialikaje kolkaści sympatykaŭ Instytutu staršynia ŭradu hurtka pračytaŭ referat z historyi biełaruskaha adradženskaha ruchu.

13 krasawika siol. hety-ž hurtok ładziŭ u m. Lachawičach, u zali Pažarnaje Stražy, biełaruskaje pradstaŭleńnie, u časie jakoha była adyhrana kamedyja „Ameryka ŭ łaźni“. Paśla pradstaŭleńnia pierad tancami moładź pad kiraŭnictwam M. Tatarynawičanki prapiajała himn BIHiK „Dzie čutny mowy našaj huki“. Samyja tancy takža pieraplatalisia śpiewami biełaruskich pieśniaŭ. Narodu na pradstaŭleńni było mnoha. Pradali biletaŭ 144 štuki na 95 zł. 90 hr. Pry tym treba skazać, što ŭrad hurtka lišnie nadziejaŭsia na sumlennaść hramadzian i za słabuju pastawiŭ kantrolu biletaŭ, a dziela hetaha nadta mnoha pranyraŭ ulezła na pradstaŭleńnie biaz biletaŭ, bo zala, źmiaščajučaja da 400 asob, była prosta zapchanaja hladzielnikami. Wośža na druhi raz treba parupicca, kab byŭ lepšy paradak.

Artysty-amatary: Zosia Karpawičanka, Naścia Milučanka, St. Karžanieŭski, P. Karpowič, A Taranda, Manujła, Kapcewič i chłapčuk Karpojčyk, pad kiraŭnictwam Michaliny Tatarynawičanki, pjesu adyhrali wielmi dobra. Asabliwa ŭdała wykanała swaju rolu Harbuzichi hram. Z. Karpowičanka. Treba tak-ža padčyrknuć sapraŭdy achwiarnuju pracu N. Milučanki i M. Tatarynawičanki, katoryja žywučy bolš jak 20 klm. ad m. Lachawič, akuratna i achwotna prychodzili i pryjaždžali pryhataŭlacca da wystupu i brali ŭdzieł u pradstaŭleńni.

U hety samy dzień — 13 IV — było naładžana biełaruskaje pradstaŭleńnie i ŭ wioscy Zarytawa, Lachawickaje wołaści.

Pierad samym Vialikodnym Światam u Zarabkowičy najechała mnoha tajnaj i jaŭnaj palicyi, jakaja rabiła badaj uwa ŭsich „trusku“. U spažywieckim kooperatywie byli znajdzieny deklaracyi na biełaruskuju školu. Kiraŭnika kooperatywu T. Zdanowiča ŭłada za niešta aštrafawała na 10 zł., a kramu apiečatała. Kažuć, što skora majuć piačaci źniać i pazwolać jznoŭ tarhawać, ale chto wiernie tyja ŭbytki, što kooperatyŭ panios, budučy začynienym, dy jašče pierad samym Wialikadniem...

U w. Račkany, Lachawickaj woł., kiraŭnik polskaje škoły mocna „zacikawiŭsia“ isnujučym tam spažywieckim kooperatywam i wielmi zachaciełasia jamu dajści da ułady ŭ henym kooperatywie. Kab dajści adnak tudy, treba mieć pasiarod siabroŭ kooperatywu swaich prychilnikaŭ, jakich jon nia maje. Ale ŭsio-ž niejak znajšoŭ krychu ludziej, daŭ im padpisać deklaracyi, a paśla hetyja deklaracyi pasłaŭ praz starastwa da ŭradu kooperatywu. Starastwa cieraz wojta prysłała hetyja deklaracyi kiraŭniku kooperatywu.

Baćka.

Беларусы павінны чытаць і пашыраць беларускую прэсу:

1. **„Беларуская Крыніца“** XX год **„Biełaruskaja Krynica“**, выданьня, палітычны, грамадзкі і літаратурны часапіс, выходзіць што тыдзень. Падпіска на год 4 зл., на паўгода — 2 зл. Адрас: Red. „Biełaruskaja Krynica“ Wilno, Zawalna 1—1.

2. **„Самапомач“—„Samapomač“**, V год выданьня, адзіны ў нас беларускі коопэратыўна-гаспадарскі часапіс, выходзіць рэгулярна што месяц. Складка на год 3 зл., на паўгода 1.75. Адрас: Red. „Samapomač“, Wilno, Połocka 9—4.

3. **„Шлях Моладзі“**, VIII-мы год выданьня, часапіс беларускай моладзі, выходзіць рэгулярна што месяц. Падпіска на год 2 зл., на паўгода 1 зл. Адрас: Red. „Šlach Moładzi“, Wilno, Zawalna 1—2.

4. **„Chryścijanskaja Dumka“**, 9-ty hod wydańnia, biełaruski katalicki časapis, wychodzić rehularna što miesiac. Padpiska na hod 3 zł., na paŭhodu — 1.50 zł. Adras: Red. „Chryścijanskaja Dumka“, Wilno, Zawalna 1—2.

5. **„Praleski“**, 3-ci hod wydańnia, biełaruski dziciačy časapis, wychodzić što miesiac. Padpiska na hod 1 zł. Adras: Red: „Praleski“, Wilno, Zawalna 1—2.

6. **„Калосьсе“**, 2-гі год выданьня, беларускі літаратурна-навуковы часапіс, выходзіць раз у тры месяцы. Складка на год 4 зл. Адрас: Red. „Kałośsie“, Wilno, Zawalna 1—2.

Беларуская газэта найтанейшая і найдаступнейшая. Пробныя нумары (апрача „Калосься“) на просьбу высылаюцца бясплатна. Пішэце выразна свае адрасы!

кае „пан“? Усіх вясковых хлапцоў Ганулька заве па іменьню; а да мяне такая ня ласка? Ці і мне трэба Ганульку зваць „паннай,“ ці „паненкай?“

Ганулька — (*нясьмела*) Не, ня трэба... Завіце мяне, як усе.

Васіль — А ты мяне— Васіль і бяз ніякага „Вы,“ а проста нашае вясковае „ты;“ гэтак прыямней і бліжэй.

Ганулька — Так... але мне неяк сорамна казаць вам «ты.»

Васіль — Чаму? А ўсім вясковым Ганулька кажа „ты“ і не сароміцца.

Ганулька — Бо ты, ты не такі, як іншыя.

Васіль — А які-жа? (*заўважыўшы яе ўзрушаньне*) Але Ганулька надта чымсь узрушана? Чым ты так устрывожана?

Ганулька — Не... не, гэта так.

Васіль — Ці ня быў тут хто? Бо запраўды, мне ўходзячы здавалася, быццам мяне хтось клікаў?

Ганулька — Не, гэта вам здалося. Я гутарыла да мамы.

Васіль — А ці-ж яна тут была?

Ганулька — Так. Але перад гэтым выйшла ў кухню. Зрэшта, былі тут Верачка і Пятрусь, і вось Пятрусь казаў мне аб вас.

Васіль — Цікава, што ён казаў? І даўно ён тут быў?

Ганулька — Ня надта. Ён зараз меўся зноў сюды прыйсьці.

Васіль — Дык, што ён такое казаў? Што магло так моцна ўстрывожыць цябе? (*жартуючы*) Мо' сватаўся?

Ганулька — (*сьмялей*) Ён казаў, што ў вас былі палісманы... што рабілі вобыск.

Васіль — Дык ты гэтым перапалохалася? (*Прыцягівае Ганульку да сябе, заглядываючы ёй у вочы*). Перапалохалася, што ў мяне вобыск? І так узварушылася? Дык ты ўсё-ж шкадуеш мяне? Праўда? Ну, скажы? Скажы? (*абнімае яе ціха рукой і паволі прыціскае да сябе*) Ну скажы?... скажы? Ці ў цябе няма ані слоўка для мяне?

Ганулька — (*лёгка баронючыся*) Васіль... ня трэба жартаў.

Васіль — (*тулячы яе да сябе*) Не, Ганулька! не, любая! Я не жартую, а кахаю. Моцна, шчыра кахаю! А ты? Ці толькі шкадуеш мяне? Ці толькі палохаешся за мяне.

Ганулька — (*схаваўшы галаву ў Васіля на грудзёх*) Інакш, ці ж шкадавала-б, Васіль!

Васіль — Кахаеш? Згодзішся быць маёй? Згодзішсяісьці разам праз жыцьцё?

Ганулька — Але, Васіль!.. Ты—бачыш... Нашто пытацца (*цалуюцца*).

Зьява 8-я.

Тыя-ж і Мар'яна.

Мар'яна — (*Увайшоўшы з кухні і ўбачыўшы іх цалуючыся, з трывогай і дакорам*).

Дык вось, што ты робіш, дачушка? (*Ганулька адскочыўшы ад Васіля*) Вось чаму ты баранілa яго ад Веркі (*да Васіля*). І ты, Васілёк, ня добра робіш, ня добра! Хоць ты мой і хрэсьнік, але ня добра.. Ты чалавек сьвятовы. Яна табе не раўня, дык нашто круціць галаву дзяўчыне? Яна бедная. За яе заступіцца няма каму, — ні бацькі, ні братоў; такую скрыўдзіць лёгка. А ты чалавек сьвятовы,... ты чалавек разумны, дык павінен гэта ведаць.

Васіль — Цётка!... Далібог мы не нблагое. Мы — кахаем адзін другога. Я і ня думаў баламуціць вам дачку.

Мар'яна — Што з таго каханьня? Нашто яно? Яна табе ня пара. Яна — бедная. Яе скрыўдзіць лёгка.

Васіль — Хто, цётка, сказаў, што я яе скрыўджу? што яна мне ня пара? А вось я прашу цётку... Вы мне хросная, дык аддайце мне Ганульку за жонку.

Мар'яна — Эт Васілёк, ня гожа табе з мяне старой сьмяяцца. Нягожа жарты строіць.

Васіль — Што вы, цётка! Ці я жартую? (*да Ганулькі*), Ну, Ганулька, памагай-жа маму пераканаць, гэта-ж і твая справа (*бярэ Ганульку за руку*) Глядзі мама, ці-ж мы ня пара? А не багатыя? — Ой, мы багатыя! Мы багатыя моладасьцю! Мы багатыя запалам і сілай да працы і жыцьця. Ці-ж шчасьце знойдзе лепшае мейсца дзе, як у нас. Праўда, Ганулька!

Ганулька — (*цалуючы руку Мар'яны*) Праўда мама, праўда! Мы будзем шчасьлівыя.

Васіль — (*таксама цалуючы руку Мар'яны*) Дык што, матка? жагнай нас старым звычаем на новае жыцьцё, ды й годзі!

Мар'яна — (*багаслаўляючы*) Дзеткі мае, дай-жа Бог вам усяго добрага!

Усякія беларускія кніжкі, газэты, часапісы найвыгадней дастанеце ў

Беларускай Кнігарні

„Пагоня“

Вільня, Завальная 1—2

Каталёг высылаецца на жаданьне бясплатна.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutewič